ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1988 г.

ЧАЦВЕР
7
КРАСАВІКА
№ 11(1569)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

У наступным нумары чытайце

ВЫ УЯЎЛЯЕЦЕ САБЕ ІНТЭРНАТ БЕЗ ГРОЗНАГА КАМЕНДАНТА? А ПРАЗ ВАХТУ, ДЗЕ НЕ БУДЗЕ ПІЛЬНАВАЦЬ, ЯК ПРЫВЫКЛІ, НЯЎМОЛЬНАЯ БАБУЛЬКА, ПРАЙСЦІ БЕЗ ПРЫГОД АТРЫМАЕЦЦА?

— Адзін мой замежны калега, паказваючы сваю ВНУ, заўважыў: «Ведаеце, чаму ў нас няма інтэрнатаў? Уся мая практыка паказвае, што студэнцкі інтэрнат — або казарма, або прытон. А я не жадаю ні першага, ні другога...»

Дык вось, нельга ісці казарменным шляхам, але нельга і прытон дапусціць,— так адказаў старшыня Дзяржаўнага камітэта СССР па народнай адукацыі Г. А. Ягадзін у інтэрв'ю «Студенческому меридиану».

ПРЫБЛІЗНА ТАК ЛІЧЫЦЬ БОЛЬШАСЦЬ З ТЫХ, ХТО АДГУКНУЎСЯ НА МАТЭРЫЯЛ НАШАЙ ГАЗЕТЫ «СУСТРЭЧНЫ ПРОПУСК: ПАНАЦЭЯ ЦІ ПАМЫЛКА?». АЛЕ ЎСЁ Ж СУСТРЭЛІСЯ І ПРОЦІЛЕГЛЫЯ МЕРКАВАННІ. ЧЫТАЙЦЕ НАСТУПНЫ НУМАР І МАГЧЫМА Ў ВАС ПАЯВЯЦЦА НЕЙКІЯ ДУМКІ. АБМЕРКАВАННЕ ПРАЦЯГВАЕЦЦА. ЯШЧЭ ЁСЦЬ ЧАС. ПІШЫЦЕ, ЗВАНІЦЕ, ЗАХОДЗЬЦЕ СА СВАІМІ ПРАПАНОВАМІ.

Беларускі універсітэт

тэлетайп

УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА

УСЕ СФЕРЫ ЖЫЦЦЯ

грамадства закранула, безумоўна, перабудова. Адбываецца гэты працэс і ў партайнай рабоце. Толькі як ён праходзіць? Вось аб гэтым і ішла гаворка на пасяджэнні бюро парткома БДУ імя У. І. Леніна, на якім была дадзена ацэнка рабоце партыйнай арганізацыі і дэканата гістарычнага факультэта па перабудове вучэбнага працэсу, развіццю студэнцкага самакіравання, дзейнаму ўдзелу кожнага выкладчыка і супрацоўніка факультэта ў палітыка-выхаваўчай, прапагандысцкай і контрпрапагандысцкай рабоце сярод студэнтаў.

Быў адобраны станоўчы вопыт у гэтым напрамку і разам з тым адзначана неабходнасць прыняць меры па ўхіленню недахопаў. Для больш рэзультатыўнай работы партыйнаму бюро гістфака рэкамендавана ўдасканальваць формы і метады сваёй дзейнасці, практыкаваць справаздачы камуністаў-кіраўнікоў на партыйных сходах, перад працоўнымі калектывамі.

Неаслабная ўвага заўсёды ўдзялялася і ўдзяляецца добраахвотным народным дружынам універсітэта. На пасяджэнні бюро парткома адзначалася, што добра працуюць ДНД біялагічнага (камандзір С. Чарноў), геаграфічнага (камандзір Я. Кулікоў) і іншых факультэтаў. Але ёсць падраздзяленні, дружыны якіх з году ў год займаюць апошнія месцы. Кіраўніцтву іх варта было б задумацца над удасканаленнем работы ДНД.

З. АЛЯКСАНДРАВА.

◆

«МАСТАЦТВА, АЗОРАНАЕ ПАЧУЦЦЯМІ»

— пад такім дэвізам пройдзе 11 красавіка (пачатак а дваццатай гадзіне) у кінатэатры «Аўрора» кінавечар, прысвечаны творчасці А. Даля.

У яго праграме: расказ аб жыццёвым і творчым шляху акцёра, урыўкі з мастацкіх фільмаў з яго ўдзелам («Старая, старая казка», «Кароль Лір», «Дрэнны добры чалавек» і інш.). Калі вам спадабаецца і з'явіцца жаданне застацца да канца вечара, вы зможаце паглядзець мастацкую кінастужку «Жэня, Жэнечка і «кацюша».

С. ЯГОРАВА,
метадыст кінатэатра «Аўрора».

Ларыса Бародзіч — студэнтка III курса факультэта прыкладной матэматыкі, займаецца ідэалагічнай работай. Палітзаняткі, палітінфармацыі, выпуск палітплаката, сходы ідэолагаў — вось далёка не поўны пералік мерапрыемстваў, за якія яна адказвае, якімі займаецца добрасумленна.

Як ставяцца аднакурснікі да яе прапаноў?

Ларыса прыгадвае, пералічваючы:

— КВЗ, палітбой падабаюцца ўсім. Таму ў асноўным падтрымліваюць. Але...

Прызнанне, якое прагучыць праз некалькі хвілін, адразу відаць, для яе не надта прыемнае, хоць ніякай Ларысінай віны ў тым, што «многія, паабяцаўшы спачатку штосьці зрабіць, калі даходзіць да справы, слова не стрымліваюць», няма.

Часам здараецца, што хлопцы, калегі па камсамольскай рабоце, паглядаюць на дзяўчат паблажліва.

— Так, — згаджаецца з такім меркаваннем Ларыса. — Толькі ў любым выпадку мне б не хацелася гэтую паблажлівасць адчуваць на сабе. Раней ідэалагічны сектар на курсе ўзначальваў хлопец (зараз займаецца ваенна-патрыятычнай работай). Трэба працаваць не горш за яго.

— А недахопы ў цябе ёсць?

— Зразумела, яшчэ колькі. І самы горшы — часам адкладваю на заўтра тое, што трэба было зрабіць сёння. Але з усімі адмоўнымі рысамі стараюся змагацца, перавыхоўваю сябе. Галоўнае, каб жыццё было без фальшу.

Л. БАНДАРЭНКА,
студэнтка факультэта журналістыкі.

СУЧАСНІК-88

РОЗДУМ НАД ФАКТАМ

У ДЗЕВЯЦІ НЯНЕК...

Як вы лічыце, колькі арганізацый маюць непасрэднае дачыненне, каб жыццё ў інтэрнаце, дзе студэнты праводзяць больш паловы свайго жыцця за час вучобы ў БДУ, прайшло з карысцю і цікавасцю для кожнага з нас? Не ведаеце? Аказваецца: дзевяць. Іменна столькі назваў намеснік дырэктара студгарадка А. М. Прылоўскі, пачаўшы прамову аб культурна-выхаваўчай рабоце са студэнтамі ў інтэрнаце на пасяджэнні прэзідыума прафкома студэнтаў. Здаецца, ужо сама іх колькасць дае падставу для аптымізму і ўсяляе надзею, што студэнты ў свой вольны час маюць багаты выбар самых розных спраў і месц для адпачынку. Але спынім увагу на такіх словах выступаючага: «Культурна-выхаваўчай работай са студэнтамі займаюцца самі студэнты: прадстаўнікі студсаветаў і прафбюро. У большасці выпадкаў усё зводзіцца да правядзення дыскатэк. Гэта амаль асноўны адпачынак ў нашых інтэрнатах».

Давайце, каб далейшая гутарка атрымалася змястоўнай, назавём тыя дзевяць арганізацый, якія павінны ўплываць на культурна-выхаваўчую работу ў інтэрнатах. Гэта: студсаветы, прафбюро факультэтаў, камітэт камсамола універсітэта, прафком студэнтаў універсітэта, камісія па рабоце са студэнтамі пры парткоме, дэканаты факультэтаў, дэканат па рабоце з замежнымі студэнтамі, студгарадок.

Кожная з іх прыкладае ўласныя намаганні і дзейнічае... асобна ад астатніх. Сумесных дзеянняў, а тым больш перспектыўных планаў — не існуе. На практыцы пакуль атрымліваецца, што кожная з дзевяці бярэ на сябе функцыю кантралюючага органа, прадстаўнікі якога, наведваючыся ў інтэрнат, патрабуюць: «зрабіць», «прыбраць», «даць адказ», «чым вы тут займаецеся?» Адзначыўшы гэта, намеснік студгарадка пералічыў тыя мерапрыемствы, што былі праведзены па сумеснаму плану студклуба і студгарадка. Праз некалькі хвілін гэта выклікае шэраг сустрэчных здзіўленых пытанняў. Першым падаў рэпліку Б. Паўс, старшыня прафбюро філфака:

— Я ўжо амаль тры гады працую на сваёй пасадзе і ніколі не бачыў, каб дырэктар або яго намеснік цікавіліся культурнымі мерапрыемствамі ў нас, у сёмым інтэрнаце.

Г. Пацёкін, намеснік старшыні прафкома студэнтаў БДУ:

«Тут гаварылася пра нейкі сумесны план студклуба і студгарадка. Хто-небудзь бачыў гэты план?»

Рэакцыя была аднолькавай: ніхто. Не трэба лічыць, што дырэкцыя студгарадка або студклуб наогул нічым у інтэрнатах не займаюцца. Але «дробязныя пытанні», адрасаваныя намесніку студгарадка, добра сведчылі аб адсутнасці інфармаванасці ў сабраўшыхся прадстаўнікоў студсаветаў, прафбюро і культурна-выхаваўчых камісій факультэтаў. Мяркуйце самі: не працуе агульная антэна ў інтэрнатах №№ 6 і 4, цяжкасці з яе рамонтам. Патрэбна праводка для радыё у інтэрнат № 1. Дзе браць транспарт, каб прывезці ў інтэрнат неабходныя для яго рэчы? На ўсе даныя пытанні былі вычарпальныя адказы. Але адбылося гэта, на жаль, толькі на сумесным сходзе, а не ў пачатку навучальнага года.

Кожны з выступаючых выносіў на абмеркаванне хвалюючыя той ці іншы інтэрнат праблемы. Справядліва было заўважана, што выхаваўчая праца са студэнтамі павінна праходзіць і праз быт, праз забеспячэнне нармальных умоў жыцця і вучобы для кожнага з нас. Як з гэтым справы?

У дакладзе прагучала такая заўвага:

«Усё для нармальнага або амаль нармальнага адпачынку і вучобы студэнтаў ёсць, праўда, не ва ўсіх інтэрнатах ў роўнай ступені. У адных менш, у другіх — больш. Але на пераважную колькасць працэнтаў абсталяванне інтэрнатаў маральна састарэла. Зразумела, у кожным інтэрнаце нашага універсітэта ў будучым павінны быць відэазала, радыёвузел, у кожным пакоі мы можам мець тэлевізар, халадзільнік. Павінен быць буфет, які б працаваў у зручны для студэнтаў, а не для грамадскага харчгандлю час. Павінна быць»,— падкрэсліў В. А. Прылоўскі. А потым звярнуў увагу на тое, што мы маем сёння.

«Студэнт бачыць, што ў першую чаргу тыя, каму належыць захоўваць сацыяльную маёмасць, ставяцца да яе нядбайна. За прыкладам далёка хадзіць не трэба. Ва універсітэце востра стаіць пытанне з інтэрнатамі, месц не хапае. Мы гэту праблему вырашаем шляхам найменшага супраціўлення, перанасяленнем іх. Аб нармальных бытавых умовах ніякай гаворкі быць не можа. Хто выйграе: мы, студэнты, дзяржава? Ніхто. Мы губляем грошы на бясконцыя планавыя рамонты, губляем маёмасць, якая не вытрымлівае ніякіх тэрмінаў эксплуатацыі, а галоўнае — людзей, у душы якіх усяляецца беспакаранасць. Адной з асноўных прычын п'янства, хуліганства, прастытуцыі, кругавой парукі, лічу, ёсць неапраўданае перанасяленне інтэрнатаў».

І з гэтым цяжка не згадзіцца. Ці вось як адзначыў старшыня прафкома студэнтаў гістфака А. Румак:

«Аб якой выхаваўчай рабоце можна гаварыць, калі ў нас, у пакоі № 18 (інтэрнат № 1) прагніла падлога і яе ўжо які месяц не могуць адрамантаваць, а тут яшчэ прайшоў першы веснавы дождж і чацвёрты паверх у нашым інтэрнаце «паплыў».

Пытанні, пытанні, пытанні... Іх было шмат на гэтым пасяджэнні прэзідыума прафкома. Але больш усяго, зразумела, хвалявала адно з іх. Каб усё, што тут заўважаецца і прапаноўваецца, не заставалася пытаннямі, а вырашалася як мага хутчэй. А пакуль што заставацца скептыкам даюць падставу вось такія назіранні.

Пасяджэнне прафкома праходзіла далёка не ў поўным саставе. Не былі запрошаны прадстаўнікі студсаветаў з усіх інтэрнатаў. І дзе гарантыя, што ўсё, аб чым гаварылі і вырашылі прысутнічаючыя, дойдзе да астатніх васьмі «шэфаў» за інтэрнаты.

Недарэмна ж гавораць, што ў сямі нянек дзіця без носа. Дык можа і не патрэбна, каб студэнтаў няньчылі ў 18 рук (арганізацый жа — дзевяць), бо, як бачна, ад такога клопату ўсім ні холадна, ні горача.

А. МАКСІМАЎ.

Фактамі і мікрафонам узброіліся ўдзельнікі рэспубліканскай навукова-метадычнай канферэнцыі па праблемах удасканалення работы і прафілактыцы правапарушэнняў сярод студэнцкай моладзі, што адбылася на юрыдычным факультэце. Чытайце падборку матэрыялаў, прысвечаных гэтай тэме.

ЄСЦЬ СПРАВА!

Ад дзесяці і старэйшыя

Ён нарадзіўся ў 1984 годзе. Тады ж атрымаў імя — ваенна-патрыятычны клуб «Дзяржынец». І добрых сяброў, якіх сёння налічваецца каля 600 чалавек. З першых жа дзён добра ўсвядоміў свае задачы (здагадваецеся, пэўна, што не сам, а з дапамогай кіраўнікоў і выкладчыкаў): выхоўваць у дзяцей і падлеткаў ідэйную загартоўку, пачуццё савецкага патрыятызму, мужнасці і адвагі, нецярпімасці да антыгрmaмадскіх з'яў, далучэнне непаўналетніх да заняткаў ваенна-прыкладнымі відамі спорту, агульнафізічнай і спецыяльнай падрыхтоўкі.

Усё пачынаецца з дэманстрацыі дыяфільмаў, чытання дзіцячых кніг, спецыяльных гульняў, у якіх «добра» і «кепска» паказваюцца ў простай форме, тлумачацца такія паняцці, як справядлівасць, дзяржава, закон. Але гэта для самых маленькіх — вучняў 3-4 класаў.

Для старэйшых наведвальнікаў клуба праводзяцца сустрэчы з прадстаўнікамі праваахоўных органаў. А дзесяцікласнікі маюць магчымасць удзельнічаць у дзяжурствах і рэйдах-праверках.

Зараз «Дзяржынец» мае прапіску ва ўтульным класе, дзе знаходзіцца невялікая, але цікавая бібліятэка, наглядная агітацыя, якую зрабілі студэнты юрыдычнага факультэта. Здаецца, добрае жыццё атрымліваецца. Так, калі б не тое, што для забеспячэння вучэбнага працэсу па прававому выхаванню ва ўсіх групах клуба неабходна болей за дваццаць грамадскіх выкладчыкаў (на сённяшні дзень працуе толькі сем). Я ж мяркую, пасля іх вырашэння, пры абсталяванні матэрыяльнай базы, клуб можа быць гарадскім метадычным цэнтрам прававой арыентацыі дзяцей і падлеткаў.

В. ГРЫНЕВІЧ,
студэнт юрфака.

ДУМКІ УСЛЫХ

Беспакаранасць гарантуецца?

Выхаваўчай работай у інтэрнатах займаецца ў наш час шэраг грамадскіх арганізацый. І ўсё ж, здараецца, студэнты — жыхары інтэрната не выконваюць элементарных правілаў паводзін, парушаюць санітарныя нормы, часам даходзіць да ўчынення злачынстваў.

Самі разумееце, выхаваць унутраную патрэбнасць у адказнасці за свае паводзіны, калі гэта не было зроблена ў школе, у дарослага чалавека цяжка. І таму ў большай частцы пакояў інтэрнатаў пануе пачуццё беспакаранасці. Быццам бы і не існуюць меры спагнанняў за антыграмадскія паводзіны. Сістэма вымоў у загадах дэканата і рашэннях студэнцкіх саветаў амаль не пужае парушальнікаў, бо праз невялікі час на іх забываюцца як тыя, хто пакараў, так і тыя, хто атрымаў спагнанне. Выселіць жа з інтэрната можна толькі за сістэматычнае парушэнне правілаў, калі меры папярэджання і грамадскага ўздзеяння не прыносяць пэўных вынікаў. Бяда, што адсутнічае механізм выяўлення парушэнняў. Між тым, стварыць яго няцяжка. Дастаткова ўвесці сістэму, якую я прапаную.

Кожны студэнт, які засяляецца ў інтэрнат, даведваецца, што ў яго актыве маецца, напрыклад, 200 балаў. За кожнае парушэнне знімаецца некалькі з іх. Далей ужо справа за простай арыфметыкай. Не прыбраў у пакоі — адкідваем 10 балаў, не прад'явіў пропуску на вахце — 3 балы, паявіўся ў лёгкай ступені ап'янення — 100 балаў. «Страціў» чвэрць балаў — прысутнічай на абмеркаванні тваіх паводзін у камітэце камсамола, растраціў 50% — атрымлівай у асабовую справу адпаведную характарыстыку, вычарпаў усе балы — шукай на наступны год кватэру. Гэта сістэма дазволіць надзейна злучыць меры выхаваўчага характару і адміністратыўнага ўздзеяння, а ў канчатковым выніку будзе садзейнічаць выхаванню ўнутранай адказнасці студэнта за свае паводзіны.

В. ЛАГОЙСКІ,
выкладчык юрыдычнага факультэта.

ТОЛЬКІ САМАЕ АСНОЎНАЕ

ПАДСТАВА ДЛЯ ДЗЕЯННЯЎ

Нават пры азнаямленні з праграмай канферэнцыі многія тэмы дакладаў выклікалі вялікую зацікаўленасць. Калі назвы «Аб разуменні маральнага выхавання асобы» ці «Фарміраванне жыццёвай пазіцыі» гучалі звыкла, то з'яўленне такіх тэм, як «Прадухіленне наркаманіі і таксікаманіі», «Аб барацьбе з п'янствам сярод навучэнцаў і студэнтаў», «Нефармальныя аб'яднанні» красамоўна сведчылі пра тое, што многія няпростыя праблемы будуць абмяркоўвацца па-дзелавому. Яно і зразумела, бо калі існуюць якія-небудзь хваробы, не трэба рабіць выгляд, што іх няма, паколькі лепшы спосаб барацьбы з хваробамі, у тым ліку і сацыяльнымі — прафілактыка.

Каля ста чалавек выступілі на трох секцыях: формы і метады прафілактыкі правапарушэнняў, маральна-прававое выхаванне навучэнцаў і асноўныя напрамкі ўзаемадзення навучальных устаноў з праваахоўнымі органамі.

Хто быў удзельнікам гэтай канферэнцыі? Перш за ўсё выкладчыкі, аспіранты і студэнты розных факультэтаў універсітэта. Выходзілі да мікрафона і прадстаўнікі Беларускага політэхнічнага інстытута, Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта, Брэсцкага педагагічнага інстытута і іншых навучальных устаноў.

Сярод гасцей канферэнцыі прысутнічалі дэканы юрыдычных факультэтаў Вільнюскага універсітэта П. І. Расімавічус, Латвійскага універсітэта Я. Р. Веберс, Кемераўскага універсітэта Ю. В. Голік, загадчыца кафедры крымінальнага права МДУ Н. Ф. Кузняцова.

Значнасць праблем, якія абмяркоўваліся, яшчэ раз была падкрэслена ў час выступлення пракурора БССР Г. С. Тарнаўскага. Яго непакоіла, што каля паловы ўдзельнікаў злачынстваў складае моладзь, а прафесар, дэкан юрыдычнага факультэта Р. І. Ціхіня адзначыў, што хоць і скарацілася за апошнія два гады злачынасць сярод студэнтаў рэспублікі ў 2,5 раза, але своечасовае выкарыстанне сродкаў прафілактыкі дазволіла б сёння папярэдзіць сем злачынстваў з дзесяці.

Прадстаўнік Міністэрства унутраных спраў БССР Ю. М. Пасельнікаў са зразумелай трывогай гаварыў, што пры дасягнутым паніжэнні колькасці ўсіх відаў злачынстваў у БССР у 1987 годзе ўзрасла лічба, якая сведчыць аб такіх злачынствах, як прыгатаванне і продаж наркотыкаў, спекуляцыя.

Характэрныя факты і назіранні былі адзначаны ў дакладзе сацыёлагаў С. М. Буравай і З. П. Каралёвай аб ролі сям'і ў прафілактыцы правапарушэнняў. Па даных сацыялагічных даследаванняў у бацькоў, якія злоўжываюць спіртным, самы высокі працэнт сыноў, якія прызвычайваюцца да алкаголю яшчэ ў дзяцінстве. У тых сем'ях, дзе маці вядзе амаральны лад жыцця, дочкі таксама становяцца правапарушальніцамі. Колькасць іх, на жаль, узрастае. Сацыёлагі падлічылі, што сярод прычын ужывання наркотыкаў і таксічных рэчываў падлеткі называлі нуду (46,4%), перайманне адзін ад аднаго і ад дарослых (60,2%). Як гаворыцца, ёсць падстава для роздуму. І дзеянняў.

Многія выступаючыя даказвалі неабходнасць самага шырокага выкладання юрыдычных дысцыплін ва ўсіх навучальных установах: як вышэйшых, так і сярэднеспецыяльных. На лекцыях па савецкаму праву навучэнцы атрымаюць веды аб яго сутнасці, межах дазволеных паводзін у розных жыццёвых сітуацыях, правах і абавязках грамадзян СССР. Крытыкаваліся прапановы выключыць савецкае права з праграмы сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў СССР.

Прагучала на канферэнцыі і думка аб неабходнасці выдання ў БССР навукова-папулярнага юрыдычнага часопіса, які адыграў бы вялікую ролю ў павышэнні прававой культуры насельніцтва.

Удзельнікі канферэнцыі прапанавалі рэкамендаваць Дзяржкамітэту БССР па народнай асвеце сумесна з Міністэрствам аховы здароўя БССР распрацаваць і зацвердзіць тэматыку і праграму спецкурсаў для вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў па прафілактыцы п'янства, наркаманіі, курэння, таксікаманіі, СНІДа.

Такая канферэнцыя праводзілася ўпершыню не толькі ў рэспубліцы, але і ва ўсёй краіне. Аб тым, ці спраўдзіла надзеі, сведчыць прапанова, што прагучала на апошнім пасяджэнні: праз год ці два зноў паўтарыць такую сустрэчу, каб падвесці вынікі, вызначыць новыя задачы.

М. ЧУДАКОЎ,
дацэнт юрыдычнага факультэта.

ПОГЛЯД ЗБОКУ

Спрэчак не атрымалася

Не зусім зразумелай здалася пазіцыя прысутных на апошнім пасяджэнні камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна. Пытанне, вынесенае на парадак дня, здавалася, не можа не хваляваць кожнага, бо, як паведаміў у сваім выступленні намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта па ідэалагічнай рабоце С. Балашэнка, недахопаў у ідэйна-палітычным выхаванні студэнтаў дастаткова на ўсіх факультэтах. Думалася, што рэакцыя выступаючых (іменна на гэта пытанне) будзе бурнай. Але, акрамя запланаваных раней прамоўцаў, узяць слова больш ніхто не пажадаў. Карацей, спрэчак не атрымалася, бо надта вялымі і неаргументаванымі былі выступленні тых, хто павінен быў задаць тон далейшаму абмеркаванню даклада.

Праўда, яно таксама, на маю думку, было пабудавана не лепшым чынам. Напрыклад, чаму б, аналізуючы работу камсамольскіх арганізацый біяфака і журфака па ідэйна-палітычнаму і маральнаму выхаванню студэнтаў, не даць слова прадстаўнікам гэтых факультэтаў першым? А потым ужо абмяркоўваць, дзе праводзіць дні універсітэта — у парку імя М. Горкага ці за горадам.

У пастанове пасяджэння камітэта камсамола вызначаны асноўныя напрамкі дзейнасці, якія патрабуюць большай увагі. У прыватнасці, гаворыцца, што патрэбна ўдасканаліць сістэму палітычнага інфармавання, у аснову якой пакласці дыскусійныя формы: дыспуты, палітбаі, вечары пытанняў і адказаў, круглыя сталы, гутаркі, тэматычныя вечары. Камітэту камсамола універсітэта і інфармацыйна-метадычнаму цэнтру прапанавана распрацаваць метадычныя рэкамендацыі па ўкараненню актыўных форм палітінфармавання.

Для паляпшэння ідэйна-палітычнага выхавання студэнтаў неабходна стварыць на факультэтах і ў інтэрнатах палітычныя дыскусійныя клубы, прыцягваючы да кіраўніцтва іх дзейнасцю выкладчыкаў кафедраў грамадскіх навук. Адзначана, што пажадана было б камітэтам камсамола факультэтаў сфарміраваць лектарскія групы і распрацаваць тэматыку лекцый па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя, помнікаў гісторыі і культуры, экалагічных праблемах, пытаннях культуры і мастацтва, гісторыі Беларусі і інш.

Спадзяёмся, камітэты камсамола факультэтаў крытычна падыдуць да ацэнкі сваёй работы, у цэнтры якой павінны стаяць пытанні ідэйна-палітычнага і маральнага выхавання, і адкарэкціруюць планы з улікам заўваг і прапаноў, якія прагучалі на пасяджэнні. На жаль, толькі з трыбуны.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

ТЫСЯЧА І АДЗІН РЭЦЭПТ ТВАЙГО АДПАЧЫНКУ

Залатая сярэдзіна



Дзень нараджэння твайго студэнцкага жыцця, які святкуецца толькі раз — медыум.

На журфаку ён яшчэ і свята адноўленай традыцыі. Пасля доўгага перапынку медыум праводзіўся трэці раз. І цяперашнія пяцікурснікі ганарацца тым, што менавіта дзякуючы ім «залатая сярэдзіна» не праходзіць для студэнтаў незаўважна.

Медыума чакаюць, да яго рыхтуюцца. Бо вечары — даволі рэдкая падзея на нашым факультэце. Перашкаджае сабрацца разам, адпачыць адсутнасць апаратуры, памяшкання... Разы трычатыры ў год ліхаманкава шукаюць магнітафоны, калонкі, збіраюць запісы, выпрошваюць залу...

А тут яшчэ ходзяць з таямнічымі тварамі рэжысёры толькі што створаных тэатраў. Шчыльна зачыняюць дзверы ў аўдыторыі і пільна сочаць, каб ні адна фраза з таго, што будзе гаварыцца на сцэне, загадзя не стала вядомай пабочнаму чалавеку.

Рыхтуецца нешта незвычайнае, што павінна здзівіць усіх. І ў вызначаны дзень і гадзіну перад заінтрыгаванай публікай адкрываецца заслона...

Медыум — гэта не толькі магчымасць павіншаваць трэцякурснікаў. Гэта — штуршок для размоў аб праблемах факультэта: жыццё ў інтэрнаце, наведванне заняткаў і адносіны да вучобы, аб шляхах іх вырашэння.

Прыемнай нечаканасцю было з'яўленне на сцэне агента Метр Шэсць-дзесят Чатыры. Дзякуючы яму С. Заяц і А. Сташэўскі азнаёмілі журфакаўцаў з «сакрэтнай перапіскай» адміністрацыі факультэта. Поспех агента быў неаспрэчны, самыя гарачыя апладысменты забраў гэты таямнічы незнаёмец. З цікавасцю глядзелася і трэцяя серыя фільма «Спрут», разыграная на сцэне чацвёртакурснікамі.

— Я лічу, што гэта — «свежы ветрык», новая форма выказвання таго, што хвалюе. А то надакучыла з году ў год слухаць адно і тое...

Стоп! Ці не варта прыслухацца да гэтага голасу? Успомніць, аб чым мы гаварылі год, два таму назад.

Пропускі заняткаў, новы будынак, канфлікты ў інтэрнаце. Канфлікты з гардэробшчыцай. Пропускі заняткаў...

Кола замыкаецца. Зразумела, кожнае прадстаўленне рыхтуецца па прынцыпу «што каму баліць, той пра тое і гаворыць». Але ж ці варта ў святочны вечар на розныя галасы плакаць аб сваёй «няшчаснай долі»? Справа пасля гэтага пойдзе не далей слоў... А нядрэнна было б замест надакучлівых перапеваў прыўнесці больш інтэлігентнасці і творчасці ў выступленні. Удумліва распрацаваць сцэнарый і паклапаціцца аб тым, каб на сцэне не было таннай імправізацыі.

Магчыма, тады апраўдаецца чаканне незвычайнага свята...

А. МАСЛА,
студэнтка журфака.
Фота **Л. ПРАЎЛОЦКАЙ.**

У нас у гасцях насценная газета «Vita»

Да выхаду ў свет нумара засталося некалькі гадзін: заклапочаны карэспандэнты і мастакі, сур'ёзным да суровасці выглядае рэдактар Сяргей Чыгір; самыя лепшыя радкі Эдуарда Монгіна нараджаюцца ў апошнія хвілінкі; над новым эсэ працуе Андрэй Сухарутчанка... Нараджаецца НУМАР!

СУСТРЭЧА З ГІСТОРЫЯЙ

АДЗІН З ПЕРШЫХ

У старых выпусках газеты «Vita», якіх у нас сабралася нямала, асабліва ў юбілейных нумарах часта можна было сустрэць прозвішча аднаго з першых рэдактараў — Мікалая Дзмітрыевіча Геся.

М. Д. Гесь вучыўся на біяфаку ў 1954—1959 гадах. А рэдактарам газеты быў не толькі ў час вучобы, але і потым. Пасля таго, як «Vita» стала займаць першыя месцы ў міжвузаўскім, а потым і ў гарадскім (праводзіўся ў той час такі) конкурсе насценных газет, М. Д. Гесь быў запрошаны на работу ў выдавецтва.

Газета называлася тады «За мичуринскую биологию». І хаця паміж сабой члены рэдкалегіі ўжо называлі газету сённяшняй назвай, афіцыйны дазвол быў атрыманы не хутка.

Іменна ў тыя гады вызначылася сучасная форма газеты. Калі адмовіліся ад прыклейвання тэкста, спатрэбілася валоданне такім мастацтвам, як вёрстка. Тут і паявіліся, а потым адшліфоўваліся прафесійныя здольнасці, якія ў будучым спатрэбіліся Н. Д. Гесю пры рабоце ў выдавецтве.

Мікалай Дзмітрыевіч гаварыў аб сур'ёзных адносінах да газеты з боку прафесараў, дэканата. Па ўзроўню выкладання біяфак займаў у той час вядучае месца ў БДУ, хаця і не карыстаўся асаблівай папулярнасцю сярод абітурыентаў. Прафесары Б. Я. Эльберт, Т. М. Годнеў, Н. М. Сяржанін не пакінулі без увагі ніводнай просьбы рэдкалегіі.

Дэкан Г. П. Пятровіч цярпліва растлумачваў рэдкалегіі (пасля чарговага крытычнага выступлення), чаму ён не можа павысіць стыпендыю студэнтцы... словам, на крытыку рэагавалі.

А «Vita» крытыкавала: змяшчала артыкулы пра тых, хто прапускае лекцыі, хто дрэнна вучыцца, нядобрасумленна адносіцца да грамадскай маёмасці, пра выкладчыкаў, якія нецікава чытаюць лекцыі...

Мы вельмі здзівіліся, убачыўшы ў архіве ў Мікалая Дзмітрыевіча друкарскія бланкі з назвай газеты. На іх у свой час яна звярталася з просьбай да сваіх пазаштатных карэспандэнтаў. Аднойчы ў тэматычны выпуск, прысвечаны прыродзе, даслалі свае матэрыялы Л. Гурунц, С. Лідзін, В. Пяскоў і іншыя.

Атмасфера творчасці, узаемаразумення, супрацоўніцтва ў рэдкалегіі, высокі прафесіяналізм дазволілі нарэшце перайсці да чорна-белага варыянта афармлення «Vitы». «Правду», «Известия» мы пазнаём, нават калі закрыем загаловак. Чаму «Vita» не можа быць такой? І яны справай даказалі, што можа. Мікалай Дзмітрыевіч успомніў імёны тых, з кім разам «чараваў» над аркушамі «Vitы». Многія з іх звязалі свой лёс з журналістыкай: супрацоўнік Інстытута гісторыі кіно В. Міхалковіч, член Саюза журналістаў СССР Н. Батурыцкая і іншыя.

Разам з новымі супрацоўнікамі ў газету прыходзіла нешта новае. Разабраўшы падшыўку, «Vity» можна раскласці (не гледзячы на год) па перыядах: выпускі розных гадоў, розных складаў рэдкалегіі — па асаблівасці «почырку» рэдактараў, мастакоў, карэспандэнтаў, нават машыністак.

У музей гісторыі універсітэта (сёння ён толькі арганізуецца) М. Д. Гесь перадаў выразкі з розных беларускіх выданняў, у якіх расказвалася пра газету, іншыя матэрыялы. Карыстаючыся выпадкам, хацелася б падзякаваць Мікалаю Дзмітрыевічу за ўдзел і дапамогу ў аднаўленні гісторыі «Vitы».

Э. МОНГІН,
Ш. ПІКАЎ,
студэнты біялагічнага факультэта.

«VITA»: 40 ГАДОЎ ПАСЛЯ...

Сорак гадоў. Тры з паловай сотні нумароў. Колькі людзей за гэты час адышлі ад газеты неабыякавымі:

— Раскрытыкавалі, бачыш ты!

— Самога дэкана, трэба ж!

— Пакуль не зачапілі. Абышлося!

Колькі студэнтаў і выкладчыкаў задумаліся над сваімі памылкамі.

Раней «Vita» выходзіла кожны тыдзень. Тэмы, якія яна асвятляла, былі актуальныя, надзённыя. Іх было больш. Зараз, калі сіл хапае толькі на штомесячны выпуск, разбіраем у асноўным шырокія, ужо досыць абмеркаваныя праблемы.

Адразу кідаецца ў вочы, што сёння газета намнога прыгажэйшая. Гэта, у першую чаргу, заслуга цяперашніх мастакоў Аляксандра Міцяніна і Віялеты Ляўданскай. Пакуль што не бачым сэнсу, каб адмаўляцца ад каляровага афармлення на карысць чорна-беламу. Газета мае права быць прыгожай.

Нельга сказаць, што нас не крытыкуюць на факультэце. Але вельмі расчароўваешся ў сваёй рабоце, калі не чуеш канкрэтных адрасатаў крытыкі, не агульнай, злой, а дзелавой, мэтанакіраванай, няхай і суб'ектыўнай.

Шчыра кажучы, насценную газету робіш у першую чаргу для сябе, для сваіх сяброў, аднакурснікаў. Самому падабаецца — ёсць шанс, што спадабаецца і іншым. І калі нумар падпісаны, здаецца, што гэта ідэал, верх дасканаласці, які цяжка будзе нават паўтарыць.

Наш неафіцыйны куратар — біятэатр, моцная нефармальная студэнцкая арганізацыя. Так ужо выходзіць, што лепшыя члены рэдкалегіі — абавязковыя ўдзельнікі біятэатраўскіх прэм'ер. А колькі такіх імён можа назваць «Vita»! Зараз у газеце больш стала гумару. Ужо што-што, а гумарыстычны аддзел у газетах людзі не прапускаюць ніколі.

Толькі што і мне давялося расстацца з рэдактарскім алоўкам — са спакойным сэрцам перадаў яго на днях Сяргею Чыгіру. Хацелася б сказаць добрыя словы і пра тых, каму «Vita» абавязана сваім тварам апошнія гады, дзякуючы каму яна зноў вярнулася ў тройку лепшых насценак універсітэта. Гэта Ірына Самусенка і Таццяна Максімава, Аляксандр Лукашук і Мікалай Чэркас, Тамара Пракапук і Эдуард Монгін, Андрэй Сухарутчанка і Алег Жук. Вялікае дзякуй ім за тую свабоду творчасці, непасрэдныя зносіны і цудоўныя адносіны, якія для мяне зараз нераздзельныя з назвай «Vita».

Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ,
рэдактар «Vitы» 1986—1988 гадоў.









НАШЫ ТРАДЫЦЫІ

На філалагічным факультэце адбыўся традыцыйны вечар выпускнікоў. У праграме вечара былі ўрачыстая частка, канцэрт, які падрыхтавалі цяперашнія студэнты факультэта і ўдачна дапоўнілі нумарамі былыя выпускнікі, дыскатэка.

Вабяць родныя сцены

У перапынку я цікавіўся ў выпускнікоў розных гадоў: «Што змянілася? Якім стаў студэнт?»

Выпускнік 1963 года, а сёння дацэнт кафедры беларускай літаратуры Вячаслаў Пятровіч Рагойша:

— Я не скажу, што сённяшні студэнт лепшы, больш старанны і разумнейшы, чым у мае гады. Мы ўсё-такі вучылі болей і старанней. Цяпер жа студэнты «бяруць навуку» сваёй інфармаванасцю.

Алегу Анціховічу, выпускніку 1986 года, я задаў пытанне: «Як справы «там»? «Там» — у школе № 171 г. Мінска, дзе Алег працуе выкладчыкам.

—У школе перабудова сярэдняй адукацыі пакуль даволі расплыўчатая. Зразумела, універсітэт не можа даць канкрэтныя ўстаноўкі і метады, накіраваныя на правядзенне перабудовы ў школе. У значнай ступені гэтая справа залежыць ад нашай свядомасці.

— А што даў універсітэт у плане прафесійнай падрыхтоўкі?

— Ёсць і «за», ёсць і «супраць». З І курса ўсе мы ведалі, што пойдзем пасля заканчэння ў школу. Але рэальнага сутыкнення са школай, па крайняй меры у нас, не было. Выдатна тое, што універсітэт выпускае найперш за ўсё адукаваных, добра ведаючых літаратуры і мовы спецыялістаў. Выкладчыку давалася універсальнасць, якая яму пры сучасным узроўні ведаў вучняў вельмі неабходна. Але, думаю, універсітэт не павінен дубліраваць педінстытут. Хацелася, каб універсітэт рыхтаваў іменна філолагаў, а не выкладчыкаў...

З усімі выпускнікамі хацелася пагутарыць. Бо хутка ж мне трэба будзе рашаць аналагічныя праблемы і цяжкасці, звязаныя з работай у будучым.

В. НАВУМЕНКА,
студэнт IV курса філалагічнага факультэта.

РАХУНАК № 703 М

НАВОШТА НАМ СЛОН?

Нядаўна ў Маскве прынята рашэнне аб адкрыцці асабістага рахунку для мінскага заасада — 703 М. Вось ужо чацвёрты год прыходзяць мінчане ў заасад МАЗа, у Чыжоўку. Гэта адзінае месца ў горадзе, дзе ў любы час можна ўбачыць каля 50 відаў звяроў і птушак. Жывых, не закатаваных да паўсмерці, як у вандроўных звярынцах.

Фактычна не абмежаваны ў перамяшчэнні капытныя: казулі, лані, ласі. Побач з двухгорбым прыгажуном-вярблюдам Ханам можна ўбачыць белых буслоў і канадскіх казарак — для вадаплаўных і каляводных птушак умовы тут амаль што ідэальныя. Яны аблюбавалі старыцу ракі Свіслач, якая летам амаль поўнасцю зарастае чаротам. З імі жывуць усю зіму, а потым застаюцца гнездавацца многія дзікія качкі. На мелкаводдзі круцяцца прыгожыя мандарынкі і каралінкі, ходзіць, задумліва перастаўляючы доўгія лапы, сапраўды султанская курыца. Важна глядзіць ачуняўшы за зіму навасёл з Ямала — серабрыстая чайка.

Каштарысная вартасць першай запланаванай чаргі заасада — 1,5 млн. рублёў. Белаўтамаз выдзеліў 400 тысяч, астатнія грошы мяркуюць атрымаць ад іншых прадпрыемстваў і арганізацый, добраахвотных узносаў мінчан. Праектам прадугледжаны прасторныя вальеры для драпежных птушак, дзікабразаў, янотаў-паласкуноў, ліс, куніц. Мяркуецца асвоіць пакуль 24 гектары тэрыторыі (для параўнання: гэта ў 1,5 раза больш, чым плошча Масквоўскага заапарка і ў 6 разоў — чым тэрыторыя Ленінградскага).

Пакуль жа, па-мойму, дастаткова глянуць на доўгую чаргу гараджан каля касы чарговага перасоўнога звярынца, каб зразумець, як неабходны Мінску заапарк.

Інстытут заалогіі АН БССР пералічыў на рахунак заасада зароблены на суботніку 400 рублёў. Кожны год па 20 тыс. рублёў абавязаўся адлічваць на гэты рахунак Дзяржкамітэт БССР па ахове прыроды.

На думку вучоных, заасад можа спецыялізавацца на ўтрыманні розных прадстаўнікоў беларускай фауны. З часам мінчане змогуць убачыць зубраў, аленяў, баброў, жураўлёў. Неўзабаве ў заасадзе будуць разводзіць рэдкія віды жывёл, магчыма, для выпуску на волю.

Пазней, пры будаўніцтве вялікага гарадскога заапарка, для чаго патрэбна каля 90 млн. рублёў,— заасад стане яго філіялам.

Зараз у заасадзе працуюць студэнтка завочнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна Ірына Бягун, выпускніца біяфака Валянціна Дубовік. Сувязі з нашым факультэтам даволі трывалыя. Заключаны нават дагавор з дэканатам аб шэфскай дапамозе заасаду. Тут пастаянна можна ўбачыць студэнтаў біяфака: яны кіруюць работай юннатаў, дапамагаюць супрацоўнікам, якія працуюць тут па сумяшчальніцтву.

Пры будаўніцтве заасада, якое працягнецца два з паловай гады, знойдзецца работа і студэнцкім будаўнічым атрадам. Так што, ці то ў рабочай форме, ці то ў выхадным касцюме заасад чакае вас (знайсці нас можна ў Чыжоўцы, прыпынак Убарэвіча, тэлефон для даведак — 40-23-77).

Ю. РАБАЎ,
А. ВАЖДЗЕЎ,
студэнты біялагічнага факультэта.

КАЛІ СПОРТ — УСЁ

Ад спартакіяды да універсіяды

Адбылася спартакіяда вышэйшых навучальных устаноў па барацьбе дзюдо (г. Наваполацк). Гэтыя спаборніцтвы з'яўляюцца адборачным этапам на Усесаюзныя студэнцкія гульні.

Універсітэт на спартакіядзе прадстаўлялі сем нашых спартсменаў, сярод іх адзін майстар спорту міжнароднага класа і чатыры майстры спорту. Цікавейшая барацьба разгарнулася паміж спартсменамі цяжкай вагі. У гэтай катэгорыі бясспрэчным кандыдатам лічыўся член зборнай каманды БПІ, чэмпіён свету сярод студэнтаў А. Шабановіч (вага 160 кг). Але ў фінале пераканаўчую перамогу атрымаў студэнт юрыдычнага факультэта Руслан Шарапаў (вага 110 кг).

У іншых вагавых катэгорыях прызёрамі сталі: Ю. Плаўсюк, А. Шапчэц і В. Пяркоўскі — усе студэнты юрыдычнага факультэта. У агульнакамандным заліку каманда БДУ заняла II месца, уступіўшы першае спартсменам ІФК. Каманду БДУ рыхтуе старшы выкладчык кафедры фізічнай культуры М. А. Брыткоў.

Пасля таго, як нашы дзюдаісты выступяць на Усесаюзных студэнцкіх гульнях, пераможцы ў сваіх вагавых катэгорыях прымуць удзел у Сусветнай універсіядзе.

С. ШАГОЛЬСКІ.

Толькі факты

Ігар Кірыльчук, студэнт I курса геафака, пераможца першынства рэспублікі сярод моладзі ўвёз з першынства СССР сярод юнакоў па класічнай барацьбе яшчэ адну пачэсную ўзнагароду. У вагавой катэгорыі (да 74 кг) ён заняў II месца.

А на першынстве рэспублікі сярод юніёраў па класічнай барацьбе прызёрамі сталі Аляксандр Шкілеўскі і Клім Буднік, студэнты геафака, I курс. (Трэнер — В. А. Рудзянкоў).

✦

Трэцяе месца заваявала зборная універсітэта па кросу сярод ВНУ рэспублікі (трэнер В. І. Зарэцкая).

✦

Пачалося і адбудзецца да 15 красавіка першынство універсітэта па валейболу.

✦

Даволі паспяхова выступілі ў гэтым годзе нашы фехтавальшчыкі, заняўшы II месца ў праграме спартакіяды ВНУ рэспублікі (трэніруе В. А. Шленскі).

ХУТКАЯ, СТРОЙНАЯ, ПРЫГОЖАЯ — ТАКОЙ Я ЎБАЧЫЛА ЯЕ Ў ПЕРШЫ РАЗ ДВА ГАДЫ НАЗАД. ЦЯПЕР МЫ АМАЛЬ СЯБРОЎКІ, ТАМУ ПІСАЦЬ МНЕ І ЛЁГКА І РАЗАМ З ТЫМ ЦЯЖКА.

ЧАСТКА МАР МАІХ ЗБЫЛАСЯ

...ПОЎНЫМ ходам ішла падрыхтоўка да міжнародных спаборніцтваў і раптам — траўма. Праз год — дзве аперацыі. Так на доўгі час трэніроўкі абарваліся... А пачынала свае першыя крокі ў спорце Вольга пасля восьмага класа, заняўшыся лёгкай атлетыкай усур'ёз. Праз два гады стала кандыдатам у майстры спорту. Дзесяты клас — юніёрская зборная Саюза. Пачала рыхтавацца да міжнародных спаборніцтваў

— Мне здаецца, што няўдачы гартавалі мой характар. Вучылася на выдатна, займалася ў мастацкай школе, шмат чытала, трэніравалася. Здаецца, нядаўна паступіла на факультэт журналістыкі, а ўжо заканчваю V курс. Так што частка маіх мар збылася.

Цяпер Вольга Сухамазава ўваходзіць ва універсітэцкую спартыўную каманду. У 1986 і 1987 гадах займала першыя месцы ў спаборніцтвах сярод студэнтаў ВНУ БССР на чэмпіянаце Белсаўпрофа.

— Гэта трэба адчуць! І старт з яго напружанасцю, сканцэнтраванасцю і падтрымкай сяброў, калі ўся каманда расцягваецца па бегавой дарожцы, а ты бяжыш, амаль без сіл, робіш рывок і перамагаеш.

Так было і на апошніх спаборніцтвах зімой гэтага года ў Гомелі. Першыя прызы аспрэчвалі каманды БДУ, грамхарча, інстытута фізкультуры. З першага віду мнагаборства Вольга лідзіравала. Трэба было так трымацца і далей. Адпачывалі мала, а тут яшчэ праблема: не хапае ўдзельнікаў эстафеты. Пасля сваіх відаў Вольга ўдзельнічала і ў ёй.

— Асабліва вось у такіх крытычных абставінах пасапраўднаму адчуваеш яднанне каманды. Адно шчырае слова, жарт, выказаны сябрам, і настрой паднімаўся, а напружанасць знікала.

На маё пытанне, што такое спорт для яе, адказала коратка:

— Амаль усё ў жыцці!

Вось ужо два гады трэніруецца Вольга ў М. А. Жаўнерка.

— Шмат чым я абавязана свайму настаўніку: і за жыццёвую навуку, і за падтрымку ў цяжкіх абставінах, і за шчырасць да людзей.

Часу вольнага ў дзяўчыны амаль што няма: кожны дзень трэніроўкі, заняткі. Таму кожную вольную хвілінку яна імкнецца правесці як мага больш цікава і карысна. Тэлевізар можа глядзець і адначасова вязаць сабе новую кофтачку, чытаць — пад музыку, а рабіць размінку, прыбіраючы пакой. Любіць яна наведаць новую выстаўку, схадзіць на новую пастаноўку ў тэатр, маляваць.

Цяпер мара Вольгі і ўсёй каманды выйсці ў «тройку» лепшых у летнім першынстве ВНУ рэспублікі і ўдзельнічаць у Кіеўскай Усесаюзнай універсіядзе.

Спадзяюся, яна здзейсніцца.

Н. ФЛАРЫЗЯК,
студэнтка факультэта журналістыкі.
Фота А. Максімава.

ХОЦЬ СНЕГУ — КОТ НАПЛАКАЎ

Калі знаходзішся ў паходзе, жывеш інакш, не так, як у буднях, пакрытых пылам празаічнасці. Мабыць таму якіх-небудзь сем дзён хады запамінаюцца надоўга, назаўсёды. Яны абуджаюць у цябе добрыя пачуцці. Гэтыя дні застаюцца ў памяці куды больш непаўторнымі, чым любыя, хай сабе і значныя, падзеі жыцця гарадскога.

У ПАХОД — КРУГЛЫ ГОД

З нашага лыжнага Зорнага паходу па Барысаўшчыне амаль усе мы — а нас было пяцёра — вярталіся з прыўзнятым настроем. Пішу «амаль усе», таму што раздвоенасць пачуццяў была толькі ў аднаго з нас — Паўла Ткачука, студэнта факультэта радыёфізікі і электронікі. Яшчэ б! Павел кіраўнік нашай групы, турыст бывалы, вопытны, таму яго адносіны да ўсяго вельмі прыдзірлівыя. У кагосьці дрэнны тэмп хады, хтосьці не па ўсіх правілах рукзак спакаваў або намазоліў сабе ногі. Ды ці мала падобных дробязей набярэцца? А з усімі імі трэба неяк спраўляцца. І было такое, што ўсур'ёз перашкаджала і ад нас не залежала. Накрыклад, паход наш лыжны, а снегу — ані. Дзе-нідзе на парыжэлай мінулагодняй траве бачны белыя плямы. Але ад такога снегу суцяшэння мала, бо наўкола вада, і толькі вібрамы слізгаюць па лёдзе. Калі ехалі ў першы ж дзень ад Барысава да вёскі Зембін — пачатковага пункта нашага маршрута — людзі ў аўтобусе пыталіся:

— Ах, дзетачкі, навошта ж вам лыжы? Снегу ж таго — кот наплакаў.

На гэта ў тон ім мы адказвалі:

— А ў нас лыжы не звычайныя, а водныя.

Адказвалі з усмешкай. Але калі гэтыя «водныя» лыжы (не такія ўжо і лёгкія, дарэчы) давялося несці ў руках, то ўсмешкі на тварах сталі з'яўляцца радзей. І не таму нават, што было цяжка фізічна. Проста крыўдна, што надвор'е нам не спрыяла. Як непрыемна было, калі аднойчы раніцай прачнуліся таму, што спальнікі былі мокрыя наскрозь, да нітачкі. Хоць выкручвай...

Лаўлю сябе на думцы, што калі б нататкі пра паход пісаў кіраўнік групы Павел, то былі б яны куды больш радаснымі. Вядома, пабачыўшы ўсялякае ў паходах, на непрыемнасці проста не звяртаеш увагі: да іх прывыкаеш. Урэшце трэба ж з імі мірыцца, бо паходам яны надаюць своеасаблівасць.

А зараз час напісаць пра добрае. На трэці дзень паход наш ужо меў права называцца «лыжным», бо снег выпаў і мы сталі на лыжы. Якая ўрачыстая прыгажосць адкрываецца вачам! Палёт бяроз і сосен паабапал дарогі. У лесе — ні душы. Толькі зрэдку сустрэнецца якінебудзь дзядзька на возе з сенам. А часам выйдзеш на былую пожню і паміж акуратненькімі стажкамі брыдзеш да вёскі. І так цягне зайсці ў якую з хат, сесці на лаву і весці гаворку з гаспадарамі — людзьмі добразычлівымі, мудрымі. Калі дазваляў час, так мы і рабілі, а потым на памяць фатаграфаваліся і адыходзілі, бо нашае — гэта дарога.

Адна з вёсак, якую праходзілі, вёска Іканы Барысаўскага раёна. Знакамітая яна тым, што мае музей народнай славы. Заснаваў яго В. В. Ігнатовіч — выдатнік народнай асветы. Большасць экспанатаў музея расказвае пра дзейнасць у гады Вялікай Айчаннай вайны партызанскай брыгады «Дзядзькі Колі» і брыгады «Смерць фашызму». Маюцца ў музеі асабістыя рэчы П. Р. Лапаціна — Героя Савецкага Саюза, камандзіра брыгады «Дзядзькі Колі», Г. С. Якімовіча, намесніка камбрыга «Смерць фашызму». Экспанаты музея самыя разнастайныя. Гэта зброя, жорны, самавар штаба, такарны станок па металу майстра зброі брыгады «Дзядзькі Колі» П. Р. Шатэркса, партызанскі гармонік, пішучая машынка, лістоўкі. Калі мы гарталі кнігу водгукаў музея, падзівіліся надзвычай багатай геаграфіі яго наведвальнікаў.

І яшчэ адзін музей мы наведалі. Ён больш сціплы, стварылі яго вучні Мсціжскай сярэдняй школы, усё новыя экспанаты знаходзяць яны да сённяшняга дня.

На тэрыторыі Бярэзінскага запаведніка ля вёскі Сялец, там, дзе чарада гонкіх дрэў суседнічае з полем, ёсць помнік Маці-партызанцы. Знаходзіцца ён удалечыні ад гулу дарог, паўз яго не снуюць туды-сюды. Да помніка прыходзяць хай сабе рэдка, але каб раздзяліць вялікі смутак Маці-партызанкі. А яна глядзіць у бок вострава Багун, на якім у гады вайны ішлі жорсткія баі з нямецкімі захопнікамі. Востраў Багун многае яшчэ помніць, менавіта таму на яго накіраваны неадрыўны позірк Маці-партызанкі.

Кіламетр за кіламетрам, гадзіна за гадзінай — і мы наблізіліся да самай сапраўднай казкі. Гэта возера Палік. Без перабольшання будзе сказаць, што гэта жамчужына Бярэзінскага запаведніка. Калі бачыш яго ўпершыню, здаецца, што трапіў у нейкую экзатычную краіну. Вока сягае туды, дзе бачацца дзівосы незямной прыгажосці. Але гэта толькі першыя ўражанні такія. Потым больш утрапёна ўглядаешся ва ўсё акаляючае і прызнаешся сабе: якой нечаканай, загадкавай можа быць прырода нашай Беларусі. Возера Палік мае працягласць тры кіламетры. Зімою яно замярзае так, што па ім смела не то што людзі ходзяць, але і машыны ездзяць. А як прыемна пасярод возера спыніцца на момант, азірнуцца і ўбачыць за сабой танюсенькую нітачку лыжні, якая недзе там далёка-далёка пачалася і не скончыцца. Проста на нейкі час перарываецца, каб працягнуцца потым на горных сцяжынках, водных маршрутах, дарогах Беларусі.

Ларыса НАВІЦКАЯ.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
7 красавіка
Зак. 1617.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.